




Днямі ў чарговы раз адбылася зацікаўленая размова наконт укаранення ў Беларусі лічбавага тэлевяшчання. Нявырашаных пытанняў, як аказалася, яшчэ шмат.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 САКАВІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № 42 (27157) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У БЕЛАРУСІ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ З ПЯТНІЦЫ 9 САКАВІКА ПЕРАНОСІЦЦА НА НЯДЗЕЛЮ 11 САКАВІКА

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі, адпаведны ўказ № 119 кіраўнік дзяржавы падпісаў 1 сакавіка.

Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос рабочага дня ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

# НЕАБХОДНА РАБІЦЬ ЧАРГОВЫЯ КРОКІ Ў РАЗВІЦЦІ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА НА ПРАСТОРЫ АЭП І АДКБ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выступае за актывізацыю ваенна-палітычнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі і ў АДКБ. Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў 1 сакавіка на сустрэчы з сакратаром Савета Бяспекі Расіі Мікалаем Патрушавым, паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе беларускага лідара.**

«Мы стварылі Адзіную эканамічную прастору. Сёння як ніколі ў нашым ваенна-палітычным саюзе АДКБ высветліліся і станоўчыя, і адмоўныя моманты, якія, тым не менш, даюць нам магчымасць гаварыць аб тым, што ўсе члены АДКБ згодныя з тым, што арганізацыя развіваецца ў патрэбным напрамку. Апошнім часам яна набыла яшчэ большы дынамізм, — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Мікалая Патрушава. — І мы пачынаем у рамках гэтай арганізацыі рабіць канкрэтныя, вельмі патрэбныя для дзяржаў крокі. З пункту гледжання дзяржаў — членаў АЭП — вельмі важная актывізацыя».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, таксама абсалютна відавочныя значэнне і роля СНД і яе структур. «Мы таксама тут практычна ўсе пытанні разумеем і бачым гэту ролю, яе значэнне, бачым тое поле, на якім дзейнічае гэта арганізацыя. Гэта датычыцца і іншых арганізацый, але асабліва нашага саюза Беларусі і Расіі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Тут вырашаны ўсе праблемы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, нагадаўшы, што адным з апошніх крокаў было зацвярджэнне ўсіх нарматыўна-прававых актаў па стварэнні Адзінай рэгіянальнай сістэмы ППА дзвюх краін.

«Мы прынялі ўсе рашэнні. Нам неабходна рабіць чарговыя крокі, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Я не хачу сказаць, што ўсё будзе проста, але камусьці і з нечага трэба пачынаць (зразумела, Беларусі і Расіі трэба пачынаць). А вось з чаго, каб быў радыкальны рух наперад, — у гэтым плане трэба вызначыцца. Ёсць сэнс абмеркаваць тыя пытанні, па якіх мы можам значна рушыць наперад».

«Лічу, што і Казахстан не будзе ўбаку. А значыць, і іншыя дзяржавы, як мінімум АДКБ. Я не гавару ўжо пра АЭП — тут у нас цеснае эканамічнае супрацоўніцтва, і, зразумела, ваенна-палітычныя пытанні не могуць адставаць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна вызначыць, якім шляхам рухацца, каб не адстаць і не «замарозіцца» на цяперашнім узроўні, як гэта было ў Саюзе Беларусі і Расіі: «Людзі разводзілі рукамі і пыталіся: а што далей будзе? Гэта значыць мы спазніліся ў свой час з ініцыятывамі».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, выбарчая кампанія ў Расіі хутка завершыцца. Ён таксама выказаў упэўненасць, што яна пройдзе паспяхова. «І мы, напэўна, ужо зможам у сакавіку-красавіку-маі, паколькі пераемнасць улады ў Расіі вельмі высокая, не губляючы часу абмяркоўваць гэтыя пытанні», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Мікалай Патрушаў адзначыў, што паміж саветамі бяспекі дзвюх краін былі праведзены вельмі цікавыя і змястоўныя кансультацыі, у тым ліку па такіх тэмах, як міжнародная і рэгіянальная бяспека, а таксама бяспека ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. «Лічу, што мы адзін аднаго пачулі і гэтыя ацэнкі будуць карысныя для далейшай сумеснай работы», — сказаў ён.

Гаворачы аб знешнепалітычным фоне вакол Беларусі, сакратар Савета Бяспекі Расіі выказаў меркаванне, што палітыка санкцый не дае пазітыўных вынікаў. Кіраўнікі Еўрасаюза лічаць магчымым вучыць іншыя дзяржавы і народы, як ім трэба жыць», — сказаў Мікалай Патрушаў.

Ён адзначыў, што ў Еўропе існуюць розныя рэжымы: манархія, прэзідэнцкая, парламенцкая форма праўлення. «Але ніхто не гаворыць, што яны недэмакратычныя. Чаму ж ставіцца пад сумненне дэмакратычнасць краіны, дзе ёсць канстытуцыя, чаму лічаць магчымым увядзенне ў тым або іншым выпадку санкцый, абмежаванняў? Гэта што, прыводзіць да станоўчых вынікаў, дапамагае народам мець паміж сабой больш цесныя стасункі? Нічога падобнага, — упэўнены Мікалай Патрушаў, — Гэтыя рашэнні пазітыўных вынікаў не даюць. Пазітыў можа быць толькі тады, калі ідуць перагаворы, дасягаюцца кампрамісы, і гэта палітыка ажыццяўляецца дыпламатычнымі метадамі. Думаю, што і ў гэтым выпадку ўсё павінна прыйсці ў норму менавіта такім шляхам».




Мінскі раён.

## ПАЧАТАК ВЯСНЫ НЕ РАДУЕ

**Прагназуецца, што ўначы на панядзелак падмарозіць да мінус 15**

У бліжэйшыя дні чакаецца няўстойлівае вільготнае і ветранае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Сёння будзе даволі воблачна, у многіх раёнах мокры снег і дождж, месцамі туман і слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. У заходняй частцы краіны ўсталюецца моцны парывісты вецер да 15—18 м/с. Максімальная тэмпература паветра 0 — плюс 6 градусаў. Аднак ужо на выхадныя да нас зноў завітае больш халоднае паветра з поўначы Еўропы. Часам будзе ісці снег, месцамі мяцеліца, на дарогах слізка. Захаваецца моцны вецер месцамі парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы на суботу будзе ўжо 1—7 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у панядзелак зноў пойдзе снег, тэмпература ўначы мінус 3—10, пры праясненнях нават да 13—15 марозу, удзень каля 0.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА:**

***«Складзены поўны збор аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва (іх зараз у сталіцы 473). Неабходны дакладны план дзеянняў, ясныя і абгрунтаваныя перспектывы з тым, каб аб'екты былі дабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю або яны павінны быць знесены ці прададзены».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8120,00 | ▲ |
| Еўра | 10810,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1014,37 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 6° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 5° |
| Магілёў | 0° |
| Мінск | + 4° |

# У КРАІНЕ НЕ ХАПАЕ МЕДЫКАЎ І ІНЖЫНЕРАЎ

**На рынку працы Беларусі адчуваецца дысбаланс попыту і прапановы. У краіне назіраецца востры дэфіцыт медыкаў і інжынераў, і ў той жа час цяжка знайсці працу юрыстам, эканамістам, бухгалтарам. Такая сітуацыя цягнецца ўжо не адзін год. Пра гэта «Звяздзе» расказаў начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай КОХАНАЎ.**

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны аналіз балансу вакансій найбольш масавых прафесій праводзіцца двойчы ў год: па стане на 1 чэрвеня і 1 снежня. Паводле апошняга аналізу, дысбаланс вакансій і зарэгістраваных беспрацоўных спецыялістаў існуе не толькі ў дачыненні да служачых і спецыялістаў, але і ў працоўных спецыяльнасцях. Так, у горадзе не хапае кіроўцаў, маляроў, муляроў, цесляроў, цесляроў-бетоншчыкаў, электраманцёраў, электрагазазваршчыкаў, швачак і інш. У вясковай мясцовасці патрабуюцца трактарысты, кіроўцы, жывёлаводы, аператары машыннага даення.

Ніжэй мы прапануем вам азнаёміцца з асноўнымі пазіцыямі па некаторых спецыяльнасцях.

| Прафесіі | горад | | вёска | |
|---|---|---|---|---|
| | вакансіі | беспрацоўныя | вакансіі | беспрацоўныя |
| урач | 948 | 13 | 44 | 2 |
| медсястра | 1046 | 73 | 79 | 17 |
| інжынер | 1351 | 337 | 273 | 39 |
| заатэхнік | — | — | 253 | 8 |
| ветэрынарны ўрач | — | — | 344 | 9 |
| аграном | — | — | 140 | 15 |
| эканаміст | 110 | 374 | 16 | 55 |
| юрыст, юрысконсульт | 65 | 210 | 20 | 24 |
| бухгалтар | 107 | 429 | 54 | 77 |

**Святлана БУСЬКО.**




Филиал ООО «АЗАРИЯАГРОПРОМ»
ЗАКУПАЕТ ТЕЛЯТ ВТОРОГО ПЕРИОДА от 200 кг (бычки).
Тел.: 8 017 202 74 71, 8 029 650 98 83
— Тимофей Михайлович.

Филиал ООО «АЗАРИЯАГРОПРОМ»
приглашает на работу СКОТНИКОВ,
оплата 2 500 000, соц. пакет.
Тел.: 8 017 202 74 71, 8 029 650 98 83
— Тимофей Михайлович.
УНП 601071324

**WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## «РАЎБІЧЫ» ЗАПРАШАЮЦЬ АМАТАРАЎ «МІНСКАЙ ЛЫЖНІ»

У гэтыя выхадныя «Раўбічы» рыхтуюцца прыняць «Мінскую лыжню» — спаборніцтвы, якія традыцыйна праходзяць у нас у канцы лютага—пачатку сакавіка ўжо больш за 25 гадоў. Траса падрыхтавана і адпавядае ўсім стандартам вялікага спорту. Праўда, як вядома, у «Мінскай лыжні» заўсёды спаборнічаюць аматары, у тым ліку і чыноўнікі самых розных узроўняў. Амаль заўсёды ў спаборніцтвах удзельнічае і кіраўнік дзяржавы.

Сёлета ў традыцыйны турнір арганізатары ўнеслі два змяненні. Першае датычыць самой трасы. Калі раней яна праходзіла па лесе і такім чынам частка дыстанцыі заставалася нябачнай для гледачоў, то сёлета яна будзе знаходзіцца бліжэй да балельшчыкаў. Такім чынам, лыжнікі ўвесь час будуць на вачах тых, хто прыедзе за іх «пахварэць». Наведнікам «Раўбічаў» і так не давядзецца сумаваць: акрамя лыжных эстафет, тут пройдуць і іншыя спаборніцтвы. Яшчэ адно новаўвядзенне тычыцца рэгламенту турніру: сёлета павялічаны ўзроставы цэнз удзельнікаў «Мінскай лыжні». У мужчынскай камандзе ўсе ўдзельнікі цяпер павінны быць ад 45 гадоў і старэй, у жаночай — ад 35. Арганізатары ўпэўнены, што гэта надасць вастрыні спаборніцтвам. Ну а сагрэцца, па традыцыі, можна будзе гарачым чаем і салдацкай кашай. Перакусіць госці свята могуць у шматлікіх выязных кавярнях і пунктах харчавання. **«Раўбічы» чакаюць усіх аматараў здаровага ладу жыцця ў нядзелю. Эстафетныя гонкі пачнуцца а 11-й гадзіне.**

**Алена КРАВЕЦ.**

## АДКУЛЬ МІНА?

**У Магілёве літаральна на тратуары знайшлі артылерыйскую міну часоў Другой сусветнай вайны.**

Яна ляжала на пешаходнай дарожцы каля Палаца гімнастыкі. Міну знайшоў дворнік: прыбраў у бок, далей ад людзей, і паведаміў адміністрацыі. Гэты чалавек расказаў, што небяспечную знаходку ўбачыў праз гадзіну пасля таго, як праехаў аўтамабіль, які пасыпаў тратуар пяском. Верагодна, што адтуль яна і вываліся. На месца здарэння адразу выехалі ўсе неабходныя службы, ачапілі тэрыторыю, пагрузілі і вывезлі міну для знішчэння.

**Алена КАЗЛОВА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У МАЛДОВЕ ЗАБАРАНІЛІ ПРОДАЖ АЛКАГОЛЮ Ў КРАМАХ З 22.00 ДА 8.00

Акрамя таго, папраўкі, унесеныя ў закон, прадугледжваюць забарону на продаж алкаголю асобам, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту. Каб пераканацца ў тым, што асоба, якая купляе алкагольную прадукцыю, дасягнула 18 гадоў, прадаўцы абавязаны будуць патрабаваць у пакупніка пашпарт ці іншыя дакументы.

### ІЗРАІЛЬ АДМОВІЎСЯ ІНФАРМАВАЦЬ ЗША АБ АТАЦЫ НА ІРАН



Кіраўніцтва Ізраіля не збіраецца апавяшчаць амерыканскія ўлады аб пачатку магчымай аперацыі па знішчэнні іранскіх ядзерных аб'ектаў, паведамляе Associated Press са спасылкай на супрацоўніка амерыканскай разведкі, знаёмага з ходам дыскусіі па гэтым пытанні. Паводле яго слоў, ізраільцяне выразна пазначылі сваю пазіцыю падчас некалькіх нядаўніх гутарак з высокапастаўленымі прадстаўнікамі амерыканскай адміністрацыі. Згодна з гэтай інфармацыяй, Ізраіль будзе трымаць ЗША ў недасведчанасці, каб ніхто не мог потым сказаць, што амерыканцы маглі, але не ўтрымалі свайго саюзніка ад нападу.

### МОЦНЫ ТАРНАДА Ў ЗША ЗАБРАЎ ЖЫЦЦІ 13 ЧАЛАВЕК

Над цэнтральнай часткай ЗША пранёсся моцны тарнада. Яго ахвярамі, паводле папярэдніх звестак, сталі 13 чалавек, яшчэ каля 100 параненыя, паведамляюць інфармагенцтвы. Ураган пачаўся ноччу, таму многія жыхары не чулі папераджальных сірэн.

Серыя тарнада абрушылася на штаты Ілінойс, Місуры, Канзас і Кентукі. Смерч, які рухаўся са скорасцю да 100 км/гадз., пакінуў пасля сябе шырокую паласу разбурэнняў: знішчаны каля 300 дамоў, з корнем вырваны дзясяткі дрэў, пашкоджаны лініі электраперадачы. У пацярпелых раёнах працуюць атрады ратавальнікаў і падраздзяленні Нацыянальнай гвардыі. Сілы пажарных і паліцыі кінуты на разбор завалаў і ахову пашкоджаных будынкаў. У Канзасе ўведзены рэжым надзвычайнай сітуацыі.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

**МЗС Украіны:**

### ПАСОЛ ЕС ПУБЛІЧНА СПРАБУЕ ЎМЕШВАЦЦА ВА ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ

МЗС Украіны выказаў незадавальненне паводзінамі пасла ЕС ва Украіне Жазэ Мануэля Пінту Тэйшэйры, заявы якога не адпавядаюць міжнародным нормам дыпламатыі. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджаным каментары Дэпартамента інфармацыйнай палітыкі.



У знешнепалітычным ведамстве Украіны са здзіўленнем назіраюць за публічнымі выказваннямі пасла, якія ад месяца да месяца ўсё менш адпавядаюць таму, што па прынятых у міжнародных зносінах традыцыях могуць сабе дазволіць дыпламаты.

«Ад сітуацыі вакол маючых адбыцца выбараў мэра Кіева да стану інвестыцыйнага клімату ва Украіне — усё тое, што звычайна з'яўляецца прадметам абмеркавання ўкраінскіх грамадзян, палітыкаў і экспертаў, рэгулярна становіцца падставай для каментароў і ацэнак чалавека, у чые афіцыйныя функцыі ўваходзіць прадстаўляць дыпламатычныя інтарэсы інтэграцыйнага аб'яднання замежных дзяржаў», — заяўляюць у МЗС краіны.

«Мы б спакойна і нават з радасцю назіралі за «ўкраінізацыяй» спадара Тэйшэйры, калі б яго паліталагічныя ацэнкі і меркаванні ўспрымаліся ўкраінскімі грамадзянамі і СМІ як яго асабістая думка, а не афіцыйная пазіцыя 27 краін — членаў Еўрасаюза», — удакладняюць у ведамстве.

## КОРАТКА

Усе аўтадарогі, якія злучаюць Мінск з абласнымі цэнтрамі, будуць платнымі, паведаміў 29 лютага журналістам міністр транспарту і камунікацый Іван Шчэрба. Сістэма спагнання платы за праезд будзе ўкаранёна на ўсіх рэспубліканскіх дарогах першай катэгорыі. У Беларусі ўжо дзейнічае адна платная дарога — М-1/Е30. У бліжэйшай будучыні платнымі стануць дарогі з Мінска на Магілёў, Гомель, Гродна, Віцебск.

З другой суботы сакавіка (а сёлета гэта 10 чысло) па другую нядзелю мая ў краіне будзе доўжыцца сезон палявання на гусей: белалобую, гуменніка, шэрую, а таксама на канадскую казарку. Паляваць дазволена зброевым спосабам з засады з вабікам. Паляўнічыя могуць выкарыстоўваць гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы з патронамі з дробам. Для пошуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстоўваць паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, выжлаў, спаніеляў, рэтрыівераў, водных сабак. Паляванне дазваляецца толькі ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін.

# ЯКАЯ ДЛЯ ВАС САМАЯ ГАЛОЎНАЯ ПРЫКМЕТА ВЯСНЫ?



**Намеснік Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра (Навагрудскі раён) ігумен ЯЎСЕВІЙ (ЦЮХЛОЎ):**

— Гукі... У нас тут ціха, таму вясну прыкмячаеш па гуках. Рака пачынае журчаць. Але найперш — птушкі! Яны і зімой прыляталі: мы іх у манастыры падкормліваем. Вось яны з пушчы альбо з суседніх лясочкаў збіраюцца і налятаюць чародкамі: паядуць, папяюць... Апошнія дні яны прылятаюць усё часцей, а неўзабаве тут стане зусім ад птушак шумна.



**Дырэктар дзіцячага дома №3 г. Мінска Таіса КУЗНЯЦОВА:**

— Калі іду з працы, а на вуліцы яшчэ светла — значыць ужо вясна!

І адразу мяняецца настрой душы, ахопліваюць новыя клопаты. Напрыклад, думаю, як будзе аформлена тэрыторыя нашага дзіцячага дома, дзе якія кветкі зацвітуць першыя, якую расаду трэба рыхтаваць для пасадкі. У нас тэрыторыя — 1,7 га, а дзеткі маленькія — дашкольнікі, таму ўсё даводзіцца рабіць самім, і зрабіць хочацца прыгожа, каб і дзеткі любаваліся, і дарослыя.

Яшчэ вось на 5 сакавіка запісалася ў цырульню — бо вясной можна ўжо хадзіць без галаўнога ўбору... Ну і мары пра.. мора. Мы дзяцей пачынаем афармляць на аздараўленне, і самі міжволі думаем пра адпачынак.



**Дырэктар Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук (г. Гомель) Аляксандр КАВАЛЕВІЧ:**

— Лес ажывае, абуджаецца. Снег яшчэ ляжыць, але ў прыродзе нешта ўжо змянілася, аўра стала іншай. Не адразу разумееш — што змянілася? Можа, галінкі змянілі колер, а можа, чалавек сам не ведае, што адчувае, як пачаўся рух соку ўнутры дрэў? Для таго, каб упэўніцца ў гэтым, неабавязкова ў лес ісці. Дастаткова проста прыгледзецца да гарадскіх або прысядзібных дрэў, каб зразумець, што вясна прыйшла.

■ Афіцыйна

## У СІЛ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АПЕРАЦЫЙ УЗБРОЕНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ СВАЕ ЭМБЛЕМА І СЦЯГ

**У мэтах захавання і развіцця гістарычных і баявых традыцый сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заснаваў геральдычны знак — эмблему, а таксама сцяг сіл спецыяльных аперацый УС РБ. Указ аб гэтым Прэзідэнт падпісаў 1 сакавіка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакументам таксама зацверджаны палажэнні аб геральдычным знаку — эмблеме і сцягу, іх апісанне і відарыс.

## СТЫПЕНДЫІ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ БУДУЦЬ АТРЫМЛІВАЦЬ 78 АСПІРАНТАЎ

**Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, такое рашэнне змешчана ў распараджэнні, якое Аляксандр Лукашэнка падпісаў 1 сакавіка.**

Стыпендыі Прэзідэнта назначаны 78 аспірантам, якія навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ў дзяржаўных установах, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы паслявузаўскай адукацыі.

Найбольшая колькасць аспірантаў выконвае дысертацыйныя даследаванні па тэхнічных (20 чалавек), эканамічных і гуманітарных (13 чалавек), медыцынскіх (11 чалавек) навуках.

31 аспірант мае выдатную паспяховасць, 7 — з'яўляюцца аўтарамі (суаўтарамі) манаграфій, 16 — маюць патэнты на вынаходствы і карысныя мадэлі.

Як растлумачылі ў прэс-службе, прыняцце такога рашэння з'яўляецца сведчаннем пастаяннай дзяржаўнай падтрымкі і стымулявання навуковай сферы.

## БЕЛАРУСКАЯ ПРЫРОДА З КІТАЙСКІМІ «РЫСАМІ»

**У хуткім часе верагодна выкарыстанне ў заканадаўчай прыродаахоўнай базе нашай краіны некаторых момантаў, якія спецыялісты з Мінпрыроды адзначылі ў досведзе кітайскіх калег падчас трохтыднёвай стажыроўкі.**

— Пакуль што пра прыняцце канкрэтных дакументаў размова не ідзе, — патлумачыў начальнік упраўлення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Андрэеў. — Але верагодна, што ў будучым мы нешта «пазычым» у кітайскіх калег. Галоўнае, каб нормы былі не горшыя, чым цяпер існуюць у нас. Напрыклад, у Кітаі існуе больш за 360 стандартаў якасці навакольнага асяроддзя. Вось у Беларусі сёння норма па ўтрыманні пылу на кубічны дэцыметр — 30 мг, а кітайцы лічаць, што максімальны паказальнік павінен быць 10 мг.

Як адзначаюць у Мінпрыроды, кітайскія законы, якія датычацца аховы навакольнага асяроддзя, досыць строгія і дасканалыя. Кітай у гэтым плане выкарыстоўвае самы лепшы досвед Еўропы і Амерыкі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■ Родны склон

# НАША МОВА ЖЫВЕ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ!

**Такія словы я пачуў ад студэнта-першакурсніка Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Учора там студэнцкая рада Інстытута кіраўніцкіх кадраў зладзіла імпрэзу-акцыю «Размаўляй па-беларуску!».**

Альма-матар дзяржаўных кіраўнікоў Беларусі вырашыла папулізаваць беларускую мову. Студэнт 1 курса факультэта кіравання Інстытута кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання **Уладзіслаў ШУМСКІ** стаў ініцыятарам падзеі: «Сучасны стан беларускай мовы не вельмі добры, бо амаль ніхто не размаўляе на ёй. Мне стала неяк сумна ад гэтай думкі — і я вырашыў зрабіць такую акцыю з дапамогай студэнцкай рады Інстытута кіраўніцкіх кадраў. Яна будзе праводзіцца ў першы дзень кожнага месяца. І кожны раз будзе нешта новае: конкурс песень, вершаў і іншае. Заахвочванняў нейкіх асаблівых няма, акрамя падарункаў у конкурсах. Надалей мы плануем аб'ядноўвацца ў нашай ініцыятыве і з іншымі ВНУ: БНТУ, БГЭУ». На жаль, у жыцці Уладзіслаў не карыстаўся беларускай мовай, бо большасць ягоных сяброў рускамоўныя. «Але я хачу размаўляць па-беларуску, — сцвярджае будучы кіраўнік. — Сярод маіх сяброў ёсць толькі адзін-два чалавекі, якія штодзённа гавораць на роднай мове. Мы ж для гэтага і праводзім акцыю: каб беларуская мова была больш папулярнай. Той, хто варожа, з недаверам ставіцца да беларускага слова, мае шанц праз акцыю пазнаёміцца з нашай мовай і адчуць, што яна вельмі прыгожая і на ёй зусім не сорамна размаўляць. Хто ведае, можа, пасля гэтага яны зменяць сваю пазіцыю».

**Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі,** лічыць акцыю выдатнай і цудоўнай. «Звычайна ў нас усё ідзе «зверху», а тут студэнты самі захацелі прыцягнуць увагу да стану беларускай мовы. Тым больш, у вядучай навучальнай установе краіны. Гэта вельмі важна, — упэўнены вучоны. — Моўны фон, так скажам, у Акадэміі ёсць: надпісы ўсе па-беларуску, дакументацыя і гэтак далей. Але іншая справа, што мала прадметаў выкладаюць на беларускай мове. У той жа час ствараецца шмат беларускамоўных падручнікаў па розных дысцыплінах. Па-беларуску выкладаецца гісторыя Беларусі, гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, а вось астатнія прадметы — часцей па-руску. Студэнты да выкладання па-беларуску ставяцца добра: калі іх пытаеш, на якой мове весці заняткі, яны самі выбіраюць беларускую. Важна, каб быў яшчэ большы стымул для студэнтаў, каб не заканчвалася ўсё толькі заняткамі. На маю думку, калі хочаш займаць у Беларусі нейкую пасаду, ты павінен аднолькава валодаць і беларускай, і рускай мовамі».

Той жа думкі прытрымліваецца і студэнт 1 курса факультэта кіравання **Кастусь ВАРАНЦОЎ**. Ён карыстаецца беларускай мовай у штодзённым жыцці і займаецца яе папулярызацыяй. «Мне вельмі прыемна, калі хтосьці можа падтрымаць размову са мною па-беларуску. Для мяне галоўнае, каб кожны мог свабодна размаўляць на роднай мове, каб, калі да яго звяртаюцца па-беларуску, ён не адказваў па-руску. Але на гэта пакуль здольны толькі прыкладна адзін з дзесяці маіх суразмоўцаў», — хуценька падлічыў Кастусь. А потым расказаў цікавую гісторыю: «Сёння адзін з выкладчыкаў абяцаў пачытаць нам лекцыю на беларускай мове, але пасля сказаў, што не ведае беларускай. І прызнаўся, што яму вельмі сорамна». Большасць выкладчыкаў, хоць і разумее беларускую, звяртацца на ёй да студэнтаў не можа. Але Кастусь думае, што адукаваны чалавек павінен ведаць аднолькава добра і тую, і другую мову, калі ўжо абедзве яны дзяржаўныя. «А яшчэ трэба, каб усе перасталі ўспрымаць беларускую мову як «сялянскую», «калгасную» і гэтак далей. Мы — беларусы, і мы — адметныя. Пра гэта трэба памятаць. Тым жа, хто дрэнна ведае мову, раю пачытаць беларускую літаратуру, паслухаць цудоўную беларускую музыку. Наша мова жыве і будзе жыць заўсёды!»

Прыемна, што малады хлопец займае такую непарушную пазіцыю. Думаю, што словы **Алены АНІСІМ, намесніка старшыні Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, старшыні Мінскай гарадской арганізацыі ТБМ,** якую таксама запрасілі на імпрэзу, нададуць яшчэ больш бадзёрасці і такім, як Кастусь і Уладзіслаў, і тым, хто яшчэ не так прыязна ставіцца да беларускай мовы:

— Тыя маладыя людзі, якія арганізавалі гэтую акцыю, прадэманстравалі сваю грамадзянскую пазіцыю, узровень свядомасці. Яны засведчылі, што з'яўляюцца асобамі неардынарнымі. Я лічу, што менавіта з такіх студэнтаў выйдуць сапраўдныя кіраўнікі, бо яны ўмеюць бачыць маштабна і здольныя на ўчынкі, запатрабаваныя грамадствам.

Алена Анісім таксама разбіла ўсе забабоны наконт няздольнасці беларускай мовы забяспечыць зносіны ва ўсіх сферах жыцця: «Каб казаць, што мова распрацаваная ці не распрацаваная, трэба ёю карыстацца і штодзённа размаўляць. Тады знойдуцца і словы, і звароты адпаведныя, таму што мова тады натуральная, калі яна гучыць штодня і паўсюль. Толькі тады яна і развіваецца. Нельга развіць мову, калі яна будзе толькі ў падручніках і кнігах, бо кнігі старэюць, а жыццё наша рухаецца далей. Прыходзяць новыя рэаліі, з'явы, і трэба адпаведным чынам гэта адлюстраваць у мове. Мова — сродак камунікацыі. Калі няма камунікацыі, то і мова «заржавее».

Прыкладам здатнасці і дасканаласці беларускага слова можна лічыць тое, што ў студэнтаў учора **англійская мова выкладалася праз беларускую,** лекцыя эканамічнай тэорыі прайшла на роднай мове. І ўсе ўсё разумелі. «Я лічу, што трэба перавесці і ўсё справаводства на беларускую мову. І неабходна, каб чыноўнікі таксама размаўлялі па-беларуску. Тады і людзі пацягнуцца за іх прыкладам. Праз пяць гадоў я таксама буду чыноўнікам і буду размаўляць па-беларуску», — пераканаў мяне ў сваёй мэтанакіраванасці і прынцыповасці Уладзіслаў Шумскі. Спадзяюся, што такіх будзе яшчэ шмат. І калі-небудзь надыдзе той дзень, калі ўсе гэтыя маладыя кіраўнікі атрымаюць пасады і скарыстаюць іх у тым ліку і для таго, каб укараняць беларускую мову ў грамадстве.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

## АБЗАЦ

◢ **Дэпутаты сельскіх выканкамаў Віцебскай вобласці задоўга да пачатку пасяўных работ правядуць апытанні вяскоўцаў і вызначаць тых, каму патрэбна дапамога ў апрацоўцы ўчасткаў. Пастанова аб гэтым прынята ўчора на пасяджэнні прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў. Не будуць забытыя і дачнікі.**

◢ У Мінску з 2 сакавіка арганізуецца работа экспрэснага аўтобуснага маршруту нумар 1035-ТК «ДС Серабранка — МВЦ «Экспабел». Аўтобус будзе хадзіць па ўсіх днях тыдня з праездам па вуліцах Якубава, Пляханава, праспекце Ракасоўскага, вуліцах Ванеева, Даўгабродскай, Казлова, праспекце Машэрава, вуліцах Чырвонай, В.Харужай, Куйбышава, Сурганава, М.Багдановіча, Кальцова, 1-му завулку Кальцова, вуліцы Мірашнічэнкі.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **Кітаянка пранасіла тэрмометр у сваіх лёгкіх 44 гады. Медыцынскі агляд 56-гадовай жанчыны закончыўся даволі дзіўнай знаходкай і ўсеагульным здзіўленнем персаналу. На рэнтгенаўскім здымку лёгкіх кітаянкі быў выразна бачны пабочны прадмет, даўжыня якога складала каля 5 сантыметраў. Тут жанчына і ўспомніла пра тэрмометр, які яна праглынула яшчэ ў 12-гадовым узросце. Тады ў дзяўчынкі была высокая тэмпература, і бацькі вырашылі памераць яе. Выпадкова дзіця праглынула тэрмометр, які быў укладзены ў рот. Сям'я не мела дастатковых сродкаў, каб звярнуцца да ўрача, ды і тэрмометр ні разу не нагадаў пра сябе, а потым і наогул пра яго забыліся. Зараз дастаць градуснік не так проста, бо пры мінімальнай неасцярожнасці ў лёгкія пацыенткі трапіць смертаносная ртуць.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

■ Мая праўда

**Бясплатны праезд студэнтаў: ЗА і СУПРАЦЬ**



## ХАЛЯВА РАЗБЭШЧВАЕ! ГЭТА ФАКТ

**Мы ўсе дарослыя людзі і павінны цудоўна разумець, што нічога ў нашым матэрыяльным свеце бясплатным не бывае: калі не ты асабіста, дык іншы ўсё адно заплаціць за нейкія выгоды, дабрабыт, паслугі. Толькі і за сябе, і, як той казаў, за таго хлопца. Цудоўна разумеем, але часам некаторыя робяць выгляд, што іх гэта не датычыцца. Каб самім перайсці ў катэгорыю «таго хлопца». Яшчэ горш, калі сваімі паводзінамі, прыкладам даем падставы так меркаваць моладзі, можна сказаць, выхоўваем у іх утрыманскую пазіцыю ледзьве не з маленства.**

...Прыгадваю званок з аднаго з раёнаў адразу пасля таго, як у сталіцы было абвешчана пра бясплатны праезд школьнікаў: маці некалькіх дзяцей была вельмі ўзрушана тым, што на мясцовым узроўні ўлады не адрэагавалі гэтак жа аператыўна на гэтую навіну. Падчас даволі эмацыянальнай размовы між іншым задаў пытанне: няўжо жанчына не разумее, што гэтая «бясплатнасць» праз некаторы час ляжа ў тым ліку і на яе плечы? Бо ніхто не адмяняў кошт на паліва, выдаткі на эксплуатацыю транспарту, выплату заробку кіроўцам аўтобусаў... Што дзеці будуць ездзіць бясплатна, але тарыфы на праезд для іншых праз нейкі час павялічацца і сама яна будзе плаціць за праязны дакумент больш? Дарэчы, неўзабаве яно так і атрымалася. Але маці цікавіла толькі эканомія сённяшняга дня, пра будучыню яна нават і думаць не хацела...

Калі давалі аналагічную льготу студэнтам на праезд у метро, ці не па тым жа сцэнарыі павінны былі далей разгортвацца падзеі? Законы эканомікі ніхто не ў стане адмяніць. І вось неўзабаве мы сапраўды пачулі, што метрапалітэн нясе страты. Потым — пра неабходнасць павялічэння тарыфаў на праезд, прычым загаварылі пра патрэбу дыферэнцыявана падыходзіць да гэтага: маўляў, кошт праезду ў метро павінен быць большым, чым у наземным транспарце. Што ж, логіка тут ёсць: метро ў параўнанні з аўтобусамі-тралейбусамі — больш камфортны від транспарту. Значыць, як і ў першым выпадку, выходзіць: дзеці — бясплатна (сапраўды, усё лепшае — ім), а іх бацькі, калі дапусціць пэўнае абагульненне, будуць аплачваць праезд і за сябе, і за іх?.. Днямі нарэшце ўголас прагучала доўгачаканае: з 1 чэрвеня гэтага года прадастаўленне льготы будзе прыпынена. Хоць праезд у метро для «нясьготных» катэгорый фактычна падаражэў ужо зараз: пры актыўных паездках ліміт магнітнай карткі вычэрпваецца яшчэ да заканчэння каляндарнага месяца. І каб карыстацца падземкай, даводзіцца зноў плаціць... Між тым на наземным транспарце па праязным можна ездзіць поўны месяц.

...А чаму, уласна, студэнтам бясплатны праезд у метро? На мой погляд, такой прэферэнцыі больш заслугоўваюць пенсіянеры. Яны сумленна працавалі доўгія гады, утрымлівалі падрастаючае пакаленне, і за гэта трэба быць удзячнымі хоць бы такім чынам. Моладзь, ніхто не аспрэчвае, наша будучыня. Толькі пакуль, акрамя гэтага авансу, ёй апеляваць няма чым. Ну не «наварочанымі» ж мабільнікамі, купленымі за бацькоўскія грошы, якія яны пачынаюць «ціскаць» у вагоне? Дарэчы, не ў кожнага працуючага дарослага чалавека ёсць апошняя мадэль «сотавіка». А дзецям — зноў жа ўсё самае лепшае. Ну, ды ў сям'і — калі ласка, але чаму мы ўсе павінны займацца дабрачыннасцю? У тым ліку і работнікі метрапалітэна, якія пры іх сапраўды цяжкай працы — пад зямлёй, без сонечнага святла — недаатрымліваюць з гэтай нагоды?

...Раніцай, едучы на працу, часам паспяваеш на яе ледзь-ледзь: на «Кастрычніцкай», бывае, даводзіцца прапускаць электрычку — не ўвайсці. Пра сесці ўвогуле гаворка не ідзе. Неяк у перапоўненым вагоне азірнуўся, дык, можа, з паўтузіна дарослых людзей налічыў навокал, астатнія — студэнты. Асноўная іх маса выходзіць практычна на трох станцыях: «Плошча Перамогі», «Якуба Коласа» і «Акадэмія навук». Апошняя — побач з рэдакцыяй. Можаце ўявіць сабе маштаб сітуацыі, калі ўлічыць, што ў наваколлях станцыі метро «Акадэмія навук» — каля дзясятка навучальных устаноў? А яшчэ гэтая «цудоўная» звычка цяперашніх юнакоў і дзяўчат — не здымаць, уваходзячы ў вагон, заплечнікі... А яны амаль усе зараз з імі ходзяць... Хоць бы культурай паводзін іншых пасажыраў аддзячылі...

Чым была дрэнная ранейшая практыка, калі школьнікі і студэнты аплачвалі палову кошту праезду? Гэта ўжо было немалой падтрымкай. Калі чалавеку сапраўды трэба некуды ехаць, думаецца, ён будзе ў стане аплаціць праезд — не так ужо дорага гэта каштуе. Моладзь і іх бацькі павіны былі б быць удзячнымі і за меншую лічбу прэферэнцый. Таму што, паўтаруся, нічога бясплатнага не бывае. Ды і ці заўсёды студэнты выкарыстоўваюць ільготу па прызначэнні? На канчатковай станцыі «Каменная Горка» неаднойчы буднымі днямі ўвечары і па выхадных ці не на працягу ўсяго дня неаднойчы заўважаў: юнакі і дзяўчаты проста тусуюцца, прызначаюць у пераходзе, у невялікіх блінных сустрэчы. А потым кампаніяй едуць, напрыклад, у кіно ці проста на «піва»...

Ці будзе з 1 верасня аднoўлена льгота для студэнтаў, вырашыцца пасля. А як па мне, дык адказ ужо сёння відавочны і адназначны.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## ЧАМУ НЕ «ПЛОЦЯЦЬ»? А ПАШАНЦАВАЛА!



**— Усе людзі як людзі, а чаго яны не *плоцяць*!? — гэткую фразу, прамоўленую голасам паважнай сівой жанчыны, я пачула ў перапоўненым аўтобусе дзень на трэці пасля таго, як мінскім студэнтам дазволілі бясплатны праезд.**

**— А вось пашанцавала нам! — парыраваў хлопец нешта ў стылі «Якое пытанне — такі і адказ».**

А пасля аказалася, што дама прычапілася да юнака, які замест праязнога паказаў студэнцкі білет, толькі з-за таго, што сама выходзіла на наступным прыпынку, а аплачваць праезд жадання не было ніякага, таму спатрэбіўся невялікі скандальчык, каб пацягнуць час. Вось так.

Ну няхай, варта пакінуць занадта эмацыянальных на падставе нераўнамернага размеркавання сацыяльных бонусаў у спакоі і паспрабаваць падумаць над тым, што ж можна сказаць у падтрымку захавання бясплатнага праезду для студэнтаў, які плануюць адмяніць на пачатку лета.

Узгадваю восень мінулага года. Першы месяц, калі не патрэбна было набываць праязны, падаўся крыху нязвыклым з-за таго, што напрыканцы яго ў кашальку не сядзела сіратліва апошняя дваццатка. Пры звычайных для мяне не надта раскошных выдатках грошай заставалася якраз столькі, каб, не сілячыся, дачакацца чарговых «фінансавых паступленняў». А можа, і патраціць на нешта незапланаванае.

За праязны на два віды транспарту, на якім дабіраюся на вучобу і працу, патрэбна аддаць каля 70 тысяч. Для сённяшняга ўзроўню цэнаў — сума зусім смешная. Нават са стыпендыі можна «адшкадаваць» без асаблівых пакут. «Чаму б гэтым студэнтам і не заплаціць? Усё роўна стыпендыю ім павялічылі, бацькі, хутчэй за ўсё, грошы таксама даюць», — абураюцца часам людзі. Але давайце падумаем, што такое гэтыя лішнія 70 тысяч у месяц. Не будзем браць у разлік выдаткі на каўбасу і кефір. Студэнты, якімі б яны ні здаваліся шумнымі і легкадумнымі, клапоцяцца не толькі пра неабходнасць напоўніць страўнік. І гэта зусім не павінна быць дзіўным. 70 тысяч — магчымасць як мінімум удвух схадзіць на добры спектакль у тэатр ці на прэм'еру ў кіно. На гэтую суму можна набыць нямала нітак для вышывання, што надзвычай актуальна для адной маёй знаёмай студэнткі, чыё хобі — ствараць прыгожыя вышываныя карціны. За 70 тысяч некаторыя студэнты могуць лішні раз з'ездзіць да бацькоў проста таму, што хочуць іх убачыць. А то пры абмежаваных фінансах візіты дадому ператвараюцца ў вылазкі «па бульбу і сала», калі сумкі вялізныя («невядома, калі яшчэ прыедзе») пакавалі-пакавалі ўсю ноч, а пагаварыць нармальна так і не паспелі.

Праціўнікі захавання бясплатнага праезду могуць запярэчыць. Маўляў, ведаем мы вас. Нехта можа і ў тэатр схадзіць на зэканомленыя грошы, але большасць на розную бязглуздзіцу патраціць, піва будзе піць на лаўцы ў парку, пужаючы дзяцей і «нясьготныя» ў плане праезду катэгорыі грамадзян. Згаджуся, хапае студэнтаў усялякіх. Толькі няўжо падобна на праўду, што чалавек, для якога самы культурны адпачынак — швэндацца без справы і пацягваць піва, пасля таго, як бясплатна ездзіў столькі месяцаў, летам, калі кандуктары зноў атрымаюць над ім уладу, ветліва так дастане грошы і аплаціць праезд? Можа быць. Адзін выпадак са ста. Можна пры гэтым і не біцца ні з кім, і не сварыцца. Праехаць «зайцам» і не папасціся спосабаў хапае.

Сярод знаёмых, калі пытаюся, што яны думаюць пра бясплатны праезд для студэнтаў, не надта добра адзываюцца пра гэта толькі тыя, хто сам не вучыцца альбо не мае дзяцей ці ўнукаў — студэнтаў. А самі віноўнікі размоў гавораць, што не разумеюць абурэння навакольных, з якім часам сутыкаюцца. Няўжо, калі б бясплатна дазволілі ездзіць не студэнтам, а, скажам, настаўнікам, яны б гэтым не карысталіся? Так, яны працуюць і з іх кішэні бяруцца падаткі. Але ж студэнты — гэта таксама будучыя падаткаплацельшчыкі, а яшчэ інвестыцыя, якая акупіцца.

Чаму патрэбна захаваць бясплатны праезд? На ўсе аргументы за гэта, зразумела, знойдуцца контраргументы і, думаю, сур'ёзныя паперы, якія паказваюць, колькі выдаткаў ідзе на магчымасць ездзіць у грамадскім транспарце задарма. Чаму патрэбна захаваць бясплатны праезд, лепш за ўсё разумеюць мамы і таты, якія цішком кладуць хатнія катлеты ў сумку свайму дарагому ва ўсіх сэнсах студэнту, каб не траціў лішняга, альбо раз у семестр стараюцца «наскрэбці» некалькі мільёнаў рублёў на яго вучобу.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ, студэнтка БДУ**

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БУДЗЬ ЧАЛАВЕКАМ — ПАКЛАПАЦІСЯ ПРА ПТУШАК

Віцебская гарадская арганізацыя БРСМ сумесна з Віцебскім заалагічным паркам упершыню праводзяць акцыю «Пакармі качак».

У Віцебску нямала сажалак, дзе застаюцца на зіму качкі. Вельмі шмат іх зімуе на сажалцы па вуліцы Цітова (за віцебскім чыгуначным вакзалам), дзе параўнальна ціха. І там сёння жыве да пяцідзесяці качак. Мясцовыя жыхары перыядычна іх падкормліваюць, але гэтага недастаткова.

Арганізатары акцыі нагадалі ў сваім звароце да гараджан, які распаўсюджваецца ў СМІ і праз інтэрнэт, што качак можна карміць не толькі хлебабулачнымі вырабамі, але і крупамі, збожжам. А калі ахвотныя не маюць магчымасці асабіста паўдзельнічаць у гэтай добрай справе, але неабыякавыя да лёсу птушак, іх заклікаюць прыносіць корм у Віцебскі заапарк. Супрацоўнікі заапарка, актывісты БРСМ, пакормяць качак самі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## 2,5 КГ РТУЦІ НА БУДПЛЯЦОЎЦЫ

Пры правядзенні рамонтных работ у падвале адміністрацыйнага будынка па вуліцы Ленінградскай у Брэсце цясляр таварыства з абмежаванай адказнасцю «Траверс» знайшоў шкляную закаркаваную ёмістасць з невядомым рэчывам, падобным на ртуць.

— Да месца быў накіраваны аўтамабіль хіміка-радыяцыйнай аховы, — расказаў старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Ёмістасць з ртуццю (а яе аказалася 2,5 кілаграма) забралі. Забруджвання навакольнага асяроддзя не зафіксавана, пацярпелых не было. Праверку па факце праводзяць работнікі Брэсцкага ГАУС.

## НАХАБСТВУ НЯМА МЕЖАЎ: ШКУРЫ «СХАВАЛІ» Ў АДХОДАХ

У Слоніме нехта выкінуў у кантэйнер для бытавых адходаў... пяць шкур казуль. Відаць, такім нахабным, прама скажам, спосабам спрабаваў «замесці сляды».

— Аднак схаваць сляды незаконнага палявання не атрымалася, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — Падчас правядзення судова-заалагічнай і ветэрынарна-санітарнай экспертызаў было ўстаноўлена, што дзікія жывёлы загінулі ад агнястрэльных раненняў. Праваахоўныя органы завялі крымінальную справу. Здабыча пяці казуль нанесла шкоду прыродзе ў памеры 300 базавых велічынь, што складае 10,5 мільёна рублёў. Дома ў аднаго з падазроных, жыхара Слоніма, было знойдзена мяса казулі і дзіка агульнай вагой 81 кілаграм. Вядзецца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАДАРОЖЖА З ГЕРАІНАМ СПЫНІЛІ

У Бабруйску затрымана буйная партыя гераіну. У аўтамабілі 25-гадовага жыхара Калінкавіч знайшлі 17 грамаў гэтага наркотыку.

Мужчына патлумачыў міліцыі, што ён знайшоў гераін і захоўваў, каб выпрабаваць яго дзеянне на сабе, а не гандляваць ім. Між тым, толькі аднаго грама гэтага наркотыку дастаткова для прыгатавання 15 доз. Гераін асабліва небяспечны, ён выклікае прывыканне практычна з першай дозы.

## ПАЖАР У ПАЛАЦЫ

У Жылiцкім палацы ў Кіраўскім раёне ліквідавалі пажар. Помнік архітэктуры XIX стагоддзя не пацярпеў.

Позна ўвечары вартаўнік адчуў пах дыму ў памяшканні, дзе вядуцца рэстраўрацыйныя работы, і адразу выклікаў дапамогу. Літаральна праз тры хвіліны выратавальнікі былі на месцы здарэння. Дзякуючы аператыўнаму ўмяшанню ўдалося пазбегнуць вялікага пажару. Пашкоджана толькі падлога, літаральна некалькі квадратных метраў.

**Алена КАЗЛОВА.**

# КАНТРОЛЬ НАД НАРКОТЫКАМІ

## У Гродне з'явіцца буйны цэнтр рэабілітацыі для нарказалежных

**Са стварэннем Мытнага саюза, адкрыццём межаў з суседняй Расіяй айчынныя спецыялісты прагназуюць рост колькасці спажыўцоў наркотыкаў. Міністэрствы аховы здароўя і ўнутраных спраў рыхтуюцца да гэтай сітуацыі. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый прадстаўляе тым часам гадавы даклад Міжнароднага камітэта па кантролі над наркотыкамі за 2011 год. Праблема наркотыкаў разглядаецца ў дакладзе з пункту гледжання раз'яднання грамадства, чаму спрыяюць сацыяльная няроўнасць, міграцыя, палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні, з'яўленне культуры нястрыманасці, змена традыцыйных каштоўнасцяў, імклівая ўрбанізацыя, канфлікты, рост індывідуалізму і спажывання, страта павагі да закона і з'яўленне мясцовай наркаэканомікі.**

<u>**Прадстаўнік ААН у Рэспубліцы Беларусь Антоніус БРУК:**</u>

— Эксперты папярэджваюць, што колькасць процiпраўных дзеянняў, якія ўчыняюцца з прымяненнем наркотыкаў, расце ва ўсім свеце. Псіхаактыўныя рэчывы часта прымяняюцца для здзяйснення замахаў сэксуальнага характару. Многія мужчыны і жанчыны неаднаразова станавіліся ахвярамі такіх злачынстваў, якія мелі на мэце іх прымушэнне да заняткаў прастытуцыяй. Забароненыя наркотыкі можна заказаць on-line праз незаконныя інтэрнэт-аптэкі паралельна з лекамі рэцэптурнага водпуску. Незаконныя інтэрнэт-аптэкі пачалі выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі для рэкламы сваіх вэб-сайтаў, наведвальнікі якіх рызыкуюць набыць небяспечныя лекавыя сродкі, у тым ліку падробкі. Еўрапейскі рэгіён па-ранейшаму займае другое ў свеце месца па аб'ёме гандлю какаінам. Акрамя таго, у Еўропе не паніжаецца незаконны выраб амфетамінаў. Расце дыяпазон рэчываў, якія з'яўляюцца прадметам злоўжывання.

Паводле ацэначных даных, у Беларусі пражывае па меншай меры 50 тысяч спажыўцоў наркотыкаў. За апошнія тры гады мы адкрылі 12 пунктаў замяшчальнай метадонавай тэрапіі для спажыўцоў наркотыкаў. Праграма ахапіла 700 кліентаў. Частка грамадскасці лічыць замяшчальную тэрапію спробай легалізацыі наркотыкаў, што не адпавядае рэчаіснасці. Метадонавая тэрапія вось ужо на працягу шасцідзесяці гадоў прымяняецца ў Заходняй Еўропе і даказала сваю эфектыўнасць. Замяшчальную тэрапію варта разглядаць як частку догляду за нарказалежнымі пацыентамі, што дазваляе ім вярнуцца да здаровага жыцця, спыніць пошук нелегальных наркотыкаў, які суправаджаецца злачынствам. Кошт метадонавай тэрапіі складае каля 120 долараў у год на чалавека. Гэта па меншай меры ў 20 разоў менш, чым кошт наркотыкаў, якія набываюцца. Такім чынам, праграма дае добры эканамічны эфект для грамадства.

<u>**Начальнік упраўлення па наркакантролі і працідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Аляксандр ГАЎРЫЛАЎ:**</u>

— Для больш аператыўнага рэагавання на з'яўленне на рынку новых наркотыкаў міністэрства ініцыявала ўвядзенне ў новую рэдакцыю Закона «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах і іх прэкурсорах» паняцця аналагавых наркатычных сродкаў і псіхатропаў — рэчываў, якія абыходзяць існуючыя меры кантролю. Адначасова прапануецца ўвесці крымінальную адказнасць за іх абарот на тэрыторыі краіны. Акрамя таго, рыхтуецца праект Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб парадку аднясення рэчываў да аналагаў наркатычных сродкаў і псіхатропаў, забароне іх незаконнага абароту і ўстанаўленні адпаведнай адказнасці — крымінальнай за абарот на тэрыторыі краіны і адміністратыўнай за рэкламу і ўжыванне ў грамадскім месцы. Такія меры дазволяць абмежаваць экспансію новых наркотыкаў у краіну да канчатковай прапрацоўкі і ўступлення ў законную сілу дапаўненняў і змяненняў у закон аб наркотыках, Крымінальны кодэкс і Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях.

У межах Мытнага саюза міністэрства прапануе зрабіць больш жорсткімі санкцыі за незаконны ўвоз наркотыкаў з тэрыторый Расіі і Казахстана. Дарэчы, Расія прыняла закон, паводле якога крайняй мерай у галіне незаконнага абароту наркотыкаў стала пажыццёвае пазбаўленне волі.

<u>**Галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Сяргей ОСІПЧЫК:**</u>

— У Беларусі назіраецца стабільны рост колькасці асоб, якія стаяць на дыспансэрным наркалагічным уліку. Пастаўлены на ўлік і 4 чалавекі ва ўзросце да 10 гадоў. Асноўнай жа колькасці нарказалежных — ад 26 да 30 гадоў. Тых, хто пакутуе ад наркаманіі, больш за ўсё ў Мінску. Ёсць і вучні школ, і навучэнцы ПТВ, студэнты тэхнікумаў і ВНУ. Не вучацца і не працуюць — каля 5 працэнтаў ад агульнай колькасці. 53 працэнты пражываюць не ў шлюбе. 21 працэнт выхоўваецца ў няпоўнай сям'і. Двойчы і болей судзімыя — каля 30 працэнтаў, адну судзімасць маюць 20 працэнтаў.

На працягу года плануецца адкрыць тры пункты замяшчальнай тэрапіі «Метадон». Гэта новая інавацыйная сацыяльная тэхналогія, якая ажыццяўляецца на тэрыторыі нашай краіны сумесна з ПРААН, дае досыць высокі эканамічны эфект. Трэба разумець, што барацьба з прапановай наркасродку, зніжэнне попыту на наркатычны сродак можа быць эфектыўнай толькі тады, калі дапаўняецца праграмамі зніжэння шкоды. Зніжэнне шкоды — гэта зніжэнне рызыкі заражэння ВІЧ, прафілактыка злачыннасці, прадухіленне захваральнасці на гепатыты, палавыя інфекцыі.

Метадонавая праграма — не адзіны метад, які дазваляе, як кажуць самі залежныя, «быць сухім», прычым на працягу 15-20 гадоў... Я лічу, гэта вельмі добры эфект. Падобныя прыклады ёсць не толькі па замяшчальнай тэрапіі, аднак існуе пэўная катэгорыя наркаспажыўцоў, якія не маюць эфекту на іншых праграмах рэабілітацыі, і метадонавая праграма з'яўляецца для іх апошняй саломінкай. За 24 месяцы залежныя аднаўляюць біялагічныя сілы арганізма, вяртаюцца да нармальнага жыцця, знаходзяць працу, ствараюць сям'ю, нараджаюць здаровых дзяцей...

Рэабілітацыйныя аддзяленні і цэнтры ёсць сёння ў кожнай вобласці. У РНПЦ псіхічнага здароўя працуюць два аддзяленні рэабілітацыі для пацыентаў з наркатычнай залежнасцю. Тым не менш, у хуткім часе ў Гродне з'явіцца буйны рэабілітацыйны цэнтр. Сродкі на яго выдаткоўвае Еўрасаюз у межах праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю, Украінай і Польшчай.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ПАНЯДЗЕЛАК, 5 САКАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.05, 7.35, 8.10, 8.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05, 16.55 Серыял «Маруся».**
**11.00, 17.45 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».**
**12.10 Камедыя «Паміж небам і зямлёй».**
**13.50** «Зорнае жыццё». «Браты і сёстры зорак».
**14.45** «Зямля беларуская». «Фаворскае святло жабінкаўскіх знічак».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Да цешчы на бліны.
**16.25** «Дыялогі пра цывілізацыю».
**18.45, 1.55** Зона Х.
**19.35** Арэна.
**20.00** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.40, 2.05** Дзень спорту.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05 Серыял «Вар'яты-2».**
**23.10** Клуб рэдактараў.
**1.10 Трылер «Турбулентнасць».**

## АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30, 0.45** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Права на абарону».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Я спяваю!».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**16.15 Камедыя «Кітайскі сервіз».**
**18.20** «Адваротны адлік». «Бандэнкіндэр» доктара Менгеле. Фільм першы.
**19.10** «Чакай мяне».
